# Выглядае як новая

## Капітальны рамонт будынка школы з мадэрнізацыяй правялі ў Пінскім раёне

**Стытычаўская сярэдняя школа была пабудавана ў 1967 годзе. У 2000-м да старой школы ўзвялі двухпавярховую прыбудову, а яшчэ праз 20 гадоў дабудавалі спартыўную залу. Але ж будынак, якому без малога 60 гадоў, даўно патрабаваў грунтоўнага абнаўлення. І вось год таму аб'ект уключылі ў план, выдзелілі фінансаванне. А сёлета ў школу прыйшлі спецыялісты СПМК № 33 ААТ «Пінсксаўгасбуд» і ў сціслыя тэрміны правялі капітальны рамонт з мадэрнізацыяй установы адукацыі.**



Як расказаў карэспандэнту газеты **дырэктар школы Міхаіл САЧКОЎСКІ,** асноўная работа вялася ў старым аднапавярховым будынку, дзе размяшчаецца пачатковая школа:

— Шэсць вучэбных кабінетаў цалкам абноўлены. Яны выглядаюць светлымі, утульнымі, тут новае ўсё: сцены, падлога, сталі, дзверы, асвятленне. Акрамя таго, будаўнікі правялі замену даху, умацавалі кроквы. Таксама правялі ўцяпленне двухпавярховага і аднапавярховага будынкаў, 38 акон заменены на новыя.

— Напрыклад, у майстэрні, дзе праходзяць урокі працы, цяпер ёсць гарачая вада, абноўлены бібліятэка, пакой дзіцячых ініцыятыў і кабінет хіміі, — працягвае Міхаіл Міхайлавіч. — Рамонт зроблены і ў санвузлах. Наогул, такое ўражанне, што пераўтварылася ўся школа. Адначасова праводзілася добраўпарадкаванне тэрыторыі. Скажам, раней не было асобнага пад'езду для прадуктовай машыны, смеццявоза, і гэта стварала дадатковыя нязручнасці, цяпер асобны пад'езд для грузавога транспарту абсталяваны. Як і пляцоўка пад кантэйнеры для бытавых адходаў. Цяпер у нас ёсць і пандус для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, — гаворыць дырэктар школы. — Адначасова заканчваем навядзенне прыгажосці на тэрыторыі, уладкоўваем клумбы, высаджваем кветкі, дэкаратыўныя кусты.

Яшчэ дырэктар расказаў, што на фінальную стадыю выходзяць клопаты па абсталяванні кабінетаў. Новая мэбля і абсталяванне паступілі ў кабінет хіміі, часткова заменена тэхнічнае начынне майстэрні. З мэбляй дапамагаюць у тым ліку спонсары. Філіял «Невель» ААТ «Пінскага мясакамбіната» памог з закупкай шафаў, сталоў, крэслаў. Збіраць, расстаўляць мэблю, рыхтаваць класы да навучальнага года дапамагаюць і бацькі.

Мама вучня 7 класа Вольга Палюховіч падзялілася з карэспандэнтам газеты радасцю з нагоды рамонту і мадэрнізацыі школы:

— Нашу школу не пазнаць! Калі хто ўпершыню заедзе ў Стытычава, можа падумаць, што гэта новая школа, узведзеная па арыгінальным праекце, дзе ў склад школьнага комплексу ўваходзяць будынкі рознага прызначэння. Тут усё новае, прыгожае. Дзецям будзе надзвычай камфортна вучыцца, займацца ў гуртках і секцыях, наведваць бібліятэку. Наша школа хоць і вясковая, але даволі перспектыўная, колькасць вучняў расце.

Паводле слоў Міхаіла Сачкоўскага, першага верасня за парты сядзе 95 вучняў, але ў наступныя гады чакаецца рост колькасці школьнікаў. Населены пункт прыгарадны, ваколіцы Пінска забудоўваюцца, а жыхары суседніх новабудоўляў усё часцей робяць выбар на карысць сельскай школы. Так што капітальны рамонт і мадэрнізацыя былі вельмі дарэчы, цяпер далёка не ўсе гарадскія школы могуць пахваліцца такімі ўмовамі для вучобы і работы.

**Віктар ГАЎРЫЛОВІЧ, начальнік аддзела па адукацыі Пінскага райвыканкама** паведаміў:

— У нашым раёне 32 установы адукацыі, дзе вучыцца каля чатырох тысяч школьнікаў. У іх праведзены рамонт, заменены вокны, зроблены рамонт фасадаў, дахаў, праведзены іншыя работы для паляпшэння ўмоў знаходжання вучняў. Але самым значным праектам гэтага года выглядае рамонт з мадэрнізацыяй Стытычаўскай сярэдняй школы, на які накіравана 1 мільён 328 тысяч рублёў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота з архіва Стытычаўскай школы.**